ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення
па адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
А.Б.Заблоцкі
"18" кастрычніка 2023 г.

ЗАДАННІ
для правядзення рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА

Дата правядзення: 31 кастрычніка 2023 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 13.00.

XI клас

Заданні	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	Усяго
Балы											

Заданне 1. Варыянтамі слова называюць такія яго разнавіднасці, якія адрозніваюцца фанетычнымі, словаўтваральнымі ці іншымі асаблівасцямі, аднак не маюць адрозненняў у лексічным значэнні і могуць свабодна ўзаемазамяняцца ў любым кантэксце.

Фанетычныя варыянты слова адрозніваюцца гукамі, акцэнтныя – месцам націску, марфалагічныя – граматычным значэннем. Размяркуйце прапанаваныя пары слоў у табліцы:

бу́йны – буйны́, бярло́г – бярло́га, Вадо́хрышча – Вадо́хрышчы, замш – за́мша, кайда́ны – кайданы́, калёга – калё́гія, кмен – кмін, кры́лца – кры́льца, пік – пі́ка, прымёта – прыкмёта, расчыні́ць – рашчыні́ць, ця́жкі – цяжкі́.

ЗАЎВАГА: усе словы пададзены ў пачатковай форме.

Максімальная колькасць балаў – 6.

Варыянты слова			Не з'яўляюцца варыянтамі аднаго слова
фанетычныя	акцэнтныя	марфалагічныя	

Заданне 2. У беларускай мове для найменне кветак выкарыстоўваецца шэраг слоў, запазычаных з лацінскай мовы ці праз яе пасрэдніцтва. Запішыце назвы гэтых кветак па-беларуску.

Максімальная колькасць балаў – 6.

Назвы кветак па-латыні	Пераклад на беларускую мову
chrysanthemum	
cichorium	
gladiolus	
hyacinthus	
jasminus	
matthiola	

Заданне 3. Унутранай формай слова мовазнаўцы лічаць прыкмету, якая ляжыць у аснове найменне. Напрыклад, асновай назвы падснежніка з'яўляецца тое, што гэта кветка расце пад снегам.

Назавіце прадметы посуду і хатняга начыння, якія маюць указаную ўнутраную форму.

Максімальная колькасць балаў – 6.

Унутраная форма	Прадмет посуду, хатняга начыння
гладкі (*гэта значыць без ручкі*)	
зроблена са шкла	
мае вузкае горла	
служыць для збівання масла	
служыць для накрывання	
у яе дояць малако	

Заданне 4. Фіналь (канцавая частка слова) -*іца* ўласцівая словам сучаснай беларускай мовы. Прывядзіце па адным прыкладзе слоў з гэтай фіналлю, якія адпавядаюць акрэсленай у табліцы характарыстыцы.

УВАГА: прыклады ў табліцы не павінны паўтарацца.

Максімальная колькасць балаў – 6.

Характарыстыка слова	Слова з фіналлю -*іца*
невытворнае слова	
назоўнік з суфіксам -*іц*-	
назоўнік з суфіксамі -*н*-, -*іц*-	
назоўнік з суфіксам -*ніц*-	
назоўнік з суфіксамі -*ль*-, -*ніц*-	
назоўнік з суфіксам -*льніц*-	

Заданне 5. Выпішыце са сказаў фразеалагізмы са злучнікам *як*, устанавіце іх структуру (граматычная аснова простага сказа, параўнальны зварот, дададзеная частка складанага сказа) і сінтаксічную ролю.

Максімальная колькасць балаў – 6.

1. Бледны як палатно, ён увесь дрыжаў, не валодаючы сабою, калі пачуў раптам знаёмы голас (*П. Галавач*).
2. З таго часу я зразумеў, што паэт не павінен трымацца рэчаіснасці як сляпы плота (*А. Мальдзіс*).
3. Дзіўна, а падабаліся яму і грубаватасць яе, і язык як брытва, і смеласць... *(А. Васілевіч)*.
4. На стале будзе, як той казаў, хлеб і да хлеба.
5. Пасля гэтай вандроўкі яна хадзіла як сама не свая.
6. Сэрца маё калацілася як хвост авечы *(У. Караткевіч)*.

	Фразеалагізм з *як*	**Структура фразеалагізма**	**Роля ў сказе**
1			
2			
3			
4			
5			
6			

Заданне 6. Знайдзіце ў кожным сказе словаформу, якая не адпавядае нормам беларускай літаратурнай мовы, і запішыце яе ў калонцы справа.

Максімальная колькасць балаў – 6.

№	**Сказ**	**Некарэктная словаформа**
1	На небе з'явілася вясёлка, і вучні не зводзілі вачэй з (*акон, вакон, вокнаў*), любуючыся ёй.	
2	– Не (*ежце, есце, ешце)* гэтых яблыкаў, яны яшчэ зялёныя.	
3	Абарона Бацькаўшчыны – *(важнейшы, найбольш важны, найважнейшы)* абавязак грамадзяніна.	
4	Да абеду маладая маці абавязкова гуляла з (*дзіцем, дзіцём, дзіцяцем*) на дварэ.	
5	Пасля *(летней, летняе, летняй)* спёкі прыйшла даждлівая восень.	
6	У полі дзяўчына назбірала нямала (*каласоў, калосся, калоссяў*).	

Заданне 7. У Рэспубліцы Беларусь прынята прысвячаць кожны новы каляндарны год якой-небудзь важнай грамадскай ідэі. Перакладзіце на беларускую мову інфармацыю пра 2023 год, ужываючы, дзе трэба, вялікую літару.

Максімальная колькасць балаў – 6.

В целях консолидации белорусского народа, укрепления в обществе идей мира и созидательного труда как главных условий развития белорусского государства президентом республики беларусь 2023 год объявлен годом мира и созидания. Ключевыми направлениями в предстоящем году будут совершенствование системы военно-патриотического воспитания населения, продвижение мирных инициатив граждан и общественности, содействие межконфессиональному диалогу, обеспечивающему мир и согласие в обществе, демонстрация преимуществ белорусской экономической модели в условиях всемирной турбулентности.

____

____

____

____

____

____

____

____

____

____

____

____

Заданне 8. Прачытайце ўрыўкі з водгуку на верш "Спадчына". У месцы пропускаў запішыце неабходную інфармацыю.

Максімальная колькасць балаў – 6.

"Ад прадзедаў спакон вякоў..."

Менавіта так пачынаецца верш "Спадчына" славутага беларускага паэта _____________________________. Гэты твор адносіцца да _____________________________ лірыкі і напісаны 4-стопным ____________________. Такім жа памерам напісаны вершы "Мужык", "Паэтам" і інш. Аўтар выкарыстоўвае ____________________________ рыфмоўку.

<...>

Настрой лірычнага героя "Спадчыны" перадаецца такім сродкам мастацкай выразнасці, як __________________ (*апалены, амшалы, нуднае*).

<…> Фінал твора выглядае некалькі нечаканым. Паэт выкарыстоўвае парадаксальную канцоўку: "*Завецца ж спадчына мая // Ўсяго* ____"

Заданне 9. Пазнайце пісьменніка па пэўных фактах, з'явах, мастацкіх вобразах, назвах мастацкіх твораў.

Максімальная колькасць балаў – 6.

Факты, з'явы, мастацкія вобразы, назвы мастацкіх твораў	Пісьменнік
Масква, "Трысцё", рэабілітацыя ў 1957 годзе, "Залатая асенняя раніца"	
Віцебшчына, чабор, "Надзя-Надзейка", "А ты ідзі!"	
Брэстчына, жаночая паэзія, "Ясельда", тэма кахання і любові	
Магілёўшчына, інтэлектуальная, гістарычная, антываенная проза, "Роднае карэнне", "Літоўскі хутарок"	
Вершы пра сялян і сялянскае жыццё, праблема статусу беларускай мовы, "Кепска будзе!", "Смык беларускі"	
Віцебшчына, лейтэнанцкая проза, праблема здрадніцтва, Пшанічны, Свіст, Карпенка	

Заданне 10. Запішыце тры паэмы, якія вы вывучалі на ўроках беларускай літаратуры, а таксама аўтараў гэтых твораў.

Назавіце шэсць агульных рыс гэтых твораў, акрамя ўжо названых.

Максімальная колькасць балаў – 6.

№	Назва твора	Аўтар
1		
2		
3		

Агульныя рысы:

1. *Жанр – паэма.*
2. ______________________________
3. ______________________________
4. ______________________________
5. ______________________________
6. ______________________________
7. ______________________________

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага
ўпраўлення
па адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
_________ А.Б.Заблоцкі
"18" кастрычніка 2023 г.

ЗАДАННІ
для правядзення рэспубліканскай алімпіяды
па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

ВОДГУК

Дата правядзення: 30 кастрычніка 2023 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 14.00.

XI клас

* * *

Я прачытала, што ў адной краіне,
Утульнай і дагледжанай надзіва,
Амаль што кожны горад – нейкі помнік
І кожнае сяло славута замкам.
І ўся яна для свету дарагая,
Уся яна – нібы музей выдатны,
Дзе самыя шумлівыя турысты
Перад красой спрадвечнаю цішэюць…

А як жа ты, мая зямля-радзіма,
А дзе твае ставежавыя замкі?
Ці ж іх мае прапрадзеды сівыя,
Умельцы-мудрацы, не будавалі?

Ці ж не ўставалі над лясістай багнай
Сырыя, але грозныя палацы?
Хіба не ззялі пад вясновым сонцам
Прысадзістыя цэрквы залатыя?

Было палацаў ранніх і пазнейшых,
Было што паказаць гасцям паважным.
Ды ледзь не ўсё, што ты ні будавала,
Пасля з'ядаў агонь нелітасцівы…

Каменне сцен крышылі ўшчэнт снарады,
Вятрэлі вітражы, і фрэскі зяблі,
А хціўыя рабаўнікі з-за свету
Разьбу жывую рэзалі нажамі…

Мая зямля, ты болей дарагая,
Чым тая, што не траціла нічога.
Твой кожны гмах на попеле замешан,
Твой кожны колас выпаен крывёю…

Еўдакія Лось
1966